# НАВІНАМІ

## дапамогі дзецям...

### ПАДТРЫМКА ДЗЯЦЕЙ І МАЦІ

З 1 студзеня 2025 года выраслі некаторыя выплаты па цяжарнасці і родах, а таксама дапамогі па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў. У прыватнасці, прыкметна вырас мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах для працуючых жанчын без шасці месяцаў страхавога стажу. Дагэтуль яны атрымлівалі палову ад бюджэту пражытачнага мінімуму. З 2025 года гэта дапамога будзе раўняцца мінімальнай зарплаце. Нагадаем, з 1 студзеня мінімалка складзе **726 рублёў** у месяц.



Змяненні закранулі і беспрацоўных будучых маці, якія стаяць на ўліку ў органах занятасці. Дагэтуль яны атрымлівалі дапамогу ў памеры паловы БПМ. Па новых правілах калі будучая маці была звольнена не пазней як за шэсць месяцаў да назначэння дапамогі, то яна стане атрымліваць 100 % БПМ.

Дапамога па доглядзе за хворым дзіцем да 14 гадоў або дзіцем-інвалідам таксама павялічыцца. З 2025 года яна дасягне мінімальнай зарплаты.

### ДАПАМОГА РУБЛЁМ

З новага года павялічацца і выплаты пры нараджэнні дзіцяці. Як патлумачылі ў Мінпрацы, пры нараджэнні першага дзіцяці аднаразовая дапамога складзе **4378 рублёў**. Плюс **437,8 рубля** складзе аднаразовая дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці.

Пры нараджэнні другога дзіцяці аднаразовая дапамога складзе **6129,2 рубля і 437,8 рубля** складзе дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці.

Пры нараджэнні трэцяга і наступных дзяцей аднаразовая дапамога дасягне **6129,2 рубля і 437,8 рубля** складзе аднаразовая дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці. І таксама неабходна не забываць пра прызначэнне сямейнага капіталу. А гэта каля 31,5 тысячы рублёў.

### ЗНАЧНАЯ ПАДТРЫМКА

З новага года ў Беларусі прадугледжаны навацыі, накіраваныя на матэрыяльную падтрымку некаторых катэгорый грамадзян. Так, з 2025 года павышаны ўзровень матэрыяльнай падтрымкі дзяцей-інвалідаў. У прыватнасці, дзецям-інвалідам у выпадку смерці аднаго з бацькоў устанаўліваецца дадатковае павышэнне да пенсіі. У залежнасці ад ступені страты здароўя павышэнне складзе ад 80 да 110 % бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва.



Таксама прадастаўлена права на датэрміновую пенсію па ўзросце татам дзяцей-інвалідаў, якія выхавалі дзіця без маці. Да гэтага падобная пенсія бацьку прызначалася, толькі калі маці дзіцяці атрымала права на гэту пенсію і адмовілася ад яе на карысць бацькі ці не паспела скарыстацца сваім правам праз смерць.

Іншая навацыя заключаецца ў тым, што датэрміновую пенсію замест маці прызначаць бацьку пры дасягненні ім узросту 58 гадоў пры ўмове, што пацверджаны факт выхавання дзіцяці-інваліда не менш як восем гадоў да яго паўналецця і стаж работы не менш як 25 гадоў, з якіх на працягу не менш пяці гадоў выплачваліся страхавыя ўзносы.

Адна з найбольш чаканых норм звязана з выплатай дапамогі на старэйшых за тры гады дзяцей у сям'і, дзе дзіця-інвалід дасягнула 18-гадовага ўзросту. Калі яму будзе ўстаноўлена I група інваліднасці з прадаўжэннем догляду, сям'я будзе атрымліваць дапамогу на іншых дзяцей, якія не дасягнулі паўналецця.

### СЯМЕЙНЫ КАПІТАЛ



З 1 студзеня 2025 года з'явілася магчымасць датэрмінова выкарыстоўваць сямейны капітал пры ўзвядзенні жылля ў шматкватэрных жылых дамах самастойна без накіравання мясцовага органа ўлады. Таксама сродкі сямейнага капіталу могуць быць выкарыстаны датэрмінова на пагашэнне крэдытаў, выдзеленых на будаўніцтва жылля, незалежна ад віду крэдыту і даты заключэння крэдытнага дагавора (у тым ліку раней за 2015 год).

— Наяўнасць ва ўласнасці жылля вызначаецца на дату заключэння крэдытнага дагавора па складзе сям'і, які ўлічваецца на дату звароту па датэрміновае распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу, — адзначылі ў Мінпрацы.

### НОВЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ЎЛАДАЛЬНІКАЎ ЖЫВЁЛ

З новага года пачалі дзейнічаць новыя патрабаванні да ўладальнікаў жывёл. Яны прадугледжаны Законам «Аб адказным абыходжанні з жывёламі». У прыватнасці, павышаныя патрабаванні будуць прад'яўляцца да ўтрымання сабак небяспечных парод. Іх уладальнікі абавязаны прайсці спецыяльныя курсы і атрымаць пасведчанне. Згодна з новымі правіламі, уладальнікі хатніх жывёл атрымаюць права на чыпіраванне сваіх гадаванцаў. Устанаўліваецца механізм часовага абмежавання права ўласнасці на жывёлу і яе канфіскацыі за парушэнне ўладальнікам умоў абыходжання з жывёлай, што пацягнула прычыненне шкоды здароўю грамадзян, жывёл або маёмасці.

**Валянцін ПАЎЛОВІЧ.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

**Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» 04 февраля 2025 в 14.00 проводит торги по продаже следующих объектов**

| № п/п | Наименование объекта продажи, технические и эксплуатационные характеристики | Начальная цена продажи составляет без учета НДС, белорусских рублей | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 722/С-254 площадью 37,4 кв. м, наименование – здание административное, назначение – здание административно-хозяйственное, составные части и принадлежности: сборно-щитовое обложенное кирпичом здание, расположенное по адресу: Могилевская область, Круглянский район, г. Круглое, ул. Могилевская, 25 | 200 000,00 (двести тысяч рублей 00 копеек) | 20 000,00 (двадцать тысяч рублей 00 копеек) |
| | Капитальное строение с инвентарным номером 722/С-258 площадью 125,0 кв. м, наименование – производственный корпус, назначение – здание нежилое, составные части и принадлежности: крупнопанельный производственный корпус, расположенное по адресу: Могилевская область, Круглянский район, г. Круглое, ул. Могилевская, 25 | | |
| | Капитальное строение с инвентарным номером 722/С-7240 протяженностью 38,1 м. п., наименование – водопроводные сети наружные, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, составные части и принадлежности: А-Участок водопроводной сети, расположенное по адресу: Могилевская область, Круглянский район, г. Круглое, 32, водопроводная сеть | | |
| | Капитальное строение с инвентарным номером 722/С-7239 протяженностью 36,5 м. п., наименование – канализационные сети наружные, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, составные части и принадлежности: А-Участок канализационной сети, расположенное по адресу: Могилевская область, Круглянский район, г. Круглое, 32, канализационная сеть | | |

**Собственник имущества:**
СМУ № 6 ОАО «БЕЛСЕЛЬЭЛЕКТРОСЕТЬСТРОЙ» 212012, Республика Беларусь, г. Могилев, ул. Челюскинцев, 174, УНП 100120777, тел. +375222646658, тел. для осмотра объектов продажи +375291696851.

**Организатор торгов:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

**Условие проведения торгов** – победителем торгов (покупателем) возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в сумме 2196,00 (Две тысячи сто девяносто шесть белорусских рублей 00 копеек).

**Лот № 1 продается на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.**

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком.

Задаток перечисляется на расчетный счет унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП»: № BY88ALFA30122641790010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Могилев, BIC: ALFABY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

**Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет сайте организатора по адресу: www.mogilev.cci.by.**

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 рабочих дней после проведения торгов.

Срок оплаты предмета торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

**Торги состоятся 04 февраля 2025 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».**

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 09.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112.

Последний срок подачи заявления – **03 февраля 2025 г. до 12.00.**

Регистрация участников торгов **04 февраля 2025 г.** с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: **(0222) 778032, +375 44 735 00 30** – Жилина Ольга Александровна.



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона, оператор ЭТП:**
ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, iin.by, iintorgi.by

**Продавец:**
ЗАО «Мальва-проспект», 223028, Минская обл., Минский р-н, с/с Ждановичский, аг. Ждановичи, ул. Линейная, д. 3, каб. 303

| № | Наименование | Начальная цена, без НДС |
|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение (магазин «Цветы»)**, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, 90, общ. пл. 192,5 кв. м | 300 000,00 долл. США в эквиваленте по курсу НБ РБ на день проведения торгов |

**Аукцион состоится 14.01.2025** (начало: 10.00, окончание: 16.00) на электронной торговой площадке iintorgi.by.
Время приема заявок: **с 03.01.2025 09.00 до 13.01.2025 г. 16.00.**
Иные сведения о порядке проведения, в том числе об оформлении участия в торгах, определении лица, выигравшего торги, опубликованы на сайте ЭТП и в ранее опубликованном извещении о проведении публичных торгов в форме электронного аукциона в газете «Звязда» № 244 от 14.12.2024 (30378), стр. 11

**Контакты: тел.: +375 17-300-90-03, +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by**